# ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЦІКАВІЦЦА РОДНАЙ МОВАЙ

Вядомы беларускі пісьменнік Францішак Багушэвіч некалі пісаў: «Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю». З гэтым выказваннем нельга не пагадзіцца. Неабходна ведаць і любіць мову, на якой размаўлялі нашыя продкі, і рабіць усё магчымае, каб захаваць яе і перадаць наступным пакаленням.

У гэтым у чарговы раз маглі ўпэўніцца студэнты, якія прысутнічалі на сустрэчы з кіраўніцтвам Віцебскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны». Так, старшыня абласной рады, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Ю.М. Бабіч расказаў, што таварыства было створана ў 1989 годзе, а на сённяшні дзень яго актыўнымі сябрамі, тымі, хто, па словах Юрыя Міхайлавіча, робіць рэальныя справы, з'яўляюцца больш за 10 тысяч чалавек. З іх прыкладна тысяча людзей пражывае ў Літве, Польшчы, Латвіі і Украіне.

Што датычыцца абласной арганізацыі, то яна была зарэгістравана 30 кастрычніка 1997 года. На сённяшні дзень на Віцебшчыне сябрамі філіі з'яўляюцца больш за 300 чалавек, а суполкі існуюць у Полацку, Глыбокім, Шаркаўшчыне і ва Ушачах.

Адно з традыцыйных мерапрыемстваў Віцебскай абласной арганізацыі ТБМ – акцыя, прымеркаваная да дня нараджэння вядомага пісьменніка і нашага земляка Васіля Быкава. Штогод 19 чэрвеня ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёна ладзіцца імпрэза з удзелам артыстаў, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў Віцебшчыны.

Яшчэ адна добрая традыцыя – агляд-конкурс па выкарыстанні беларускай мовы ў перыядычных выданнях Віцебскай вобласці, які праходзіць раз на тры гады. Дарэчы, у 2015 годзе яго пераможцамі былі названыя такія выданні, як «Браслаўская звязда», «Герой працы» (Шуміліна), «Патрыёт» (Ушачы) і «Міёрскія навіны».

Адзін з актыўных сяброў Віцебскай абласной арганізацыі ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны», выкладчык кафедры літаратуры нашага ўніверсітэта Вольга Фёдараўна Сянькова адзначыла, што калі размаўляе па-беларуску, то адчувае сябе «ў сваёй стыхіі». А загадчык літаратурна-драматычнай часткі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, выпускнік факультэта беларускай філалогіі і культуры нашай ВНУ Алесь Замкоўскі прызнаўся, што без роднай мовы няма спектакля, бо яна для тэатра такі ж інструмент, як і артыст. Па словах Алеся, большасць акцёраў не размаўляе па-беларуску ў жыцці, для іх нацыянальная мова – мова працы, але ж, калі патрэбна, на сцэне яны могуць «пераключыцца» і гаварыць натуральна.

Напрыканцы сустрэчы Юрый Міхайлавіч падагуліў: «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны сёння – самая масавая недзяржаўная арганізацыя ў Беларусі. Яна аб'ядноўвае ўсіх, хто цікавіцца роднай мовай і каму хочацца штодзённа на ёй размаўляць».

**Алеся ВАРКУЛЕВІЧ,**
**студэнтка 2-га курса ФлФ.**